МГПУ им. И.П.Шамякина

## ПРАВАВОЕ СТАНОВІШЧА ЖАНЧЫНЫ Ў ВКЛ

Кудлач Ю. В. (УА МДПУ імя І. П. Шамякіна)

Становішча жанчыны ў Сярэднявеччы устаноўлівалася і рэгулявалася адпаведнымі правамі. Як вядома, у гэты перыяд гісторыі ўзровень прававой рэгуляцыі сацыяльнага жыцця быў высокі, «прызнавалася існаванне толькі за

тым, што валодала прававым статусам». Тым не менш, згадзімся, заканадаўства, асабліва ў эпоху Сярэднявечча, не цалкам адлюстроўвала сапраўднае становішча жанчыны ў грамадстве; рэальныя магчымасці атрымліваць у спадчыну маёмасць, займацца эканамічнай дзейнасцю, уплываць на палітычную сітуацыю ў краіне былі значна шырэй, чым гэта было устаноўлена юрыдычнымі нормамі. Саслоўная іерархія, якая існавала ў сярэднявечным грамадстве, датычылася і жанчын. Сацыяльны статус жанчыны, як і статус мужчыны, вызначаўся нараджэннем. Лічылася, што ў жылах шляхты цячэ кроў іншая, чым, напрыклад, у селяніна; а жанчына падзяляла статус бацькі і мужа, і таму мужчыны нізкага паходжання павінны былі праяўляць павагу да жанчыны больш высокага сацыяльнага статусу. І ўсё ж паміж статусам шляхетных і незнатных мужчын дыстанцыя была большай, чым паміж статусам шляхетных і незнатных жанчын.

Эпоха ВКЛ – гэта час мужчын. Але казаць аб тым, што жанчыны былі заўсёды на другім плане, зусім нельга.

Канцэпцыя жаночага раўнапраўя на тэрыторыіі ВКЛ была ўпершыню сфарміраваная і абгрунтаваная ў канцы XVI стагоддзя. У рамках рэнесанскай ідэалогіі, мноства канфесій і грамадскіх плыняў “літвінцы” (жыхары беларускіх зямель таго часу) прадастаўлялася параўнальна вялікая свабода выбару, жанчынам прывівала цікавасць да грамадскіх справаў, выхоўвалася пачуццё далучальнасці да лёсу дзяржавы і народа. Знакаміты Статут ВКЛ 1588 г. абвясціў прыярытэт абароны інтарэсаў кожнага вольнага чалавека “ад вышэйшага стану аж да ніжага”.

Стваральнікі Статута вырашылі шэраг прававых праблем у духу эпохі Адраджэння. Гэты найважнейшы дакумент беларускай гісторыі зыходзіў з распаўсюджанага ў эпоху Рэнесансу ідэалу суверэннай асобы. Гуманістычныя матывы асабліва моцна гучаць у артыкулах, прысвечаных жанчынам. З гэтага часу годнасць жанчын падлягала судовай абароне, што сведчыла аб асаблівай “жаночай” рэвалюцыі ў раннім заканадаўстве, тым больш што некаторыя артыкулы бралі пад абарону і жанчын “простага стану” (артыкул XII, артыкул 5, 6).

У Статуце выразна было прапісана, што выдаваць жанчыну замуж можна было толькі з яе згоды. Але і яна не мела права выйсці замуж без згоды бацькоў ці сваякоў. Калі ў яе ўжо наступіў шлюбны ўзрост, а сваякі выдаваць яе замуж не спяшаліся, то яна магла падаць скаргу ў суд, такія выпадкі былі. І тады свецкая ўлада выдавала яе замуж. Хоць у судах і зафіксаваныя выпадкі шлюбу пад прымусам, але яны не насілі масавы характар.

Першыя законы ВКЛ прадугледжвалі роўныя правы на маёмасць і спадчыну, устанаўлівалі пакаранне за гвалт над жанчынай, адмену пакарання “горлам” (смяротны прысуд) цяжарным. Упершыню прадугледжвалася адказнасць за злачынствы маральнага плана. У гэтым прававым і маральным клімаце сфарміраваўся асаблівы жаночы характар. Напрыклад, доўгі час пасля смерці ваяводы караля II Рудога Трокскім ваяводствам кіравала яго

МГПУ им. И.П.Шамякина

энергічная жонка Ганна Мазавецкая з роду Радзівілаў. Выдатнымі прыкладамі жанчын, якія з розумам кіравалі мужчынамі, з'яўляюцца Соф'я Вітаўтаўна, Алена Глінская, Кацярына Ягелонка.

Наогул, у жонак і дочак феадалаў Вялікага Княства Літоўскага было шмат магчымасцяў для ўплыву на эканоміку і палітыку. Гэта быў час выхавання вальнадумства і пачуцця асабістай годнасці. Пацвярджэннем служыць мноства жаночых імёнаў, якімі багата гісторыя навукі, культуры, асветы і прадпрымальніцтва дадзенага перыяду. Не дзіўна, што сёння XVI стагоддзе называюць "залатым стагоддзем" беларуска-літоўскай дзяржавы.

Патрэбна звярнуць увагу на тое, што жанчыны простага паходжання таксама не былі цалкам выключаныя з рэлігійнага і грамадскага жыцця. У канцы XVI і пачатку XVII стагоддзя ў спісе каштоўнай маёмасці гараджан з'яўляюцца ў нямалай колькасці кнігі. Акрамя літаратуры рэлігійнага зместу вельмі часта сустракаюцца і папулярныя любоўныя гісторыі. Цяжка ўявіць, што такога роду літаратуру мог чытаць мужчына. Тое, што цяпер называецца жаночымі раманамі, не магло сур'ёзна захапіць строгіх купцоў і рамеснікаў XVI–XVII стагоддзя.

Жанчына ў ВКЛ валодала самастойнасцю і ў фінансавым плане. Часта пасаг не з'яўляўся агульнай уласнасцю мужа і жонкі, а быў стартавым капіталам, які разумная жонка магла выкарыстоўваць па свайму вырашэнню. Часта мужы-п'яніцы, якія прапілі частку пасагу, пасля першай жа скаргі ў суд іх каханых, аказваліся надоўга ў турме.

Маёмасць, якую атрымала жанчына па завяшчанні, таксама з'ўлялася яе ўласнасцю. Таму не трэба здзіўляцца, што жаночыя аперацыі з нерухомасцю і грашовымі сродкамі амаль не саступаюць па аб'ёмах мужчынскім, а што датычыцца імкненнем ў любой канфліктнай сітуацыі змагацца за сваю маёмасць да канца, то тут наогул варта адзначыць асаблівую цвёрдасць слабага полу.

Нярэдка здараліся і кур'ёзныя выпадкі. У гарадскіх актах быў знойдзены такі дагавор: муж прадаваў свой агарод жонцы з той умовай, каб яна аплаціла яго даўгі і ў далейшым карміла да самай смерці. Пытанне: хто тут слабы пол?

Часта жанчыны зыходзілі з прынятага на ўзбраенне многімі мужчынамі прынцыпу права моцнага і спрабавалі самастойна вырашаць свае праблемы, купчыхі і арандатаршы здзяйснялі напады на сваіх праціўнікаў, часцяком самі становіліся на чале ўзброеных атрадаў слуг і наймітаў.

Адзін з выпадкаў, калі супраць чыноўніка, які зарваўся, быў вінаваты ў шматлікіх злоўжываннях і крыўдах, паўстаў увесь горад, але аказалася, што жонка арыштаванага па загадзе магістрата можа прычыніць гараджанам куды больш бед, чым сам чыноўнік. Барацьба паміж гараджанамі і жонкай чыноўніка здзяйснялася з пераменнымі поспехамі на працягу двух гадоў і скончылася пасля ўмяшання караля смяротным прысудам для абодвух мужа і жонкі.

МГПУ им. И.П.Шамякина

У сялянскіх судах існавала правіла, якое абмяжоўвала жаночыя правы – не надаваць увагі сведчанням жанчыны. Пратлумачыць гэта вельмі проста: жаночыя сваркі былі празмерна частыя. Але усё ж такі двух сведак па адной справе патрэбна было абавязкова выслухаць. А вось сваркі паміж суседкамі, нярэдка якія прыводзілі да шматликих наступстваў, разбіраліся вельмі старанна.

Злачынствы супраць жанчын, як і вінаватых у распусьце прадстаўніц слабага полу, каралі вельмі сурова. Пры гэтым расследаванні такіх спраў вяліся асабліва старанна, і пытанне маралі тут было не першарадным. Размова ішла ў першую чаргу аб максімальнай абароне самой жанчыны. Насільнікаў спачатку найжорстка катавалі, а пасля аддавалі пакаранням. Калі ж гаворка ішла аб «непрыстойных паводзінах» жанчыны, то на думку самаго суда, пакаранне было больш лаяльным, чым для асоб, якія садзейнічалі злачынствам супраць маральнасці.

Жанчыны ў ВКЛ, пасля прыняцця Статута 1588 года, мелі значныя магчымасці і вялікі уплыў, яна была паўнацэнным членам грамадства і суб’ектам права. У сілу сваіх абставін, якія склаліся у той, пераважна мужчынскі, час, рэалізаваць сябе ў розных сферах жыцця жанчына магла па-за залежнасці ад паходжання і сацыяльнага статусу.

МГПУ им. И.П.Шамякина